# “Франка”, “Гараш”, “Акуака”...

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтва пройдзе Тыдзень беларускага кіно. У праграме мерапрыемства, што адбудзецца з 25 па 28 лютага, паказы фільмаў маладых беларускіх рэжысёраў, а таксама сустрэчы з аўтарамі і абмеркаванні.**

**Калектыў Вялікага тэатра Беларусі выказвае спачуванні начальніку аддзела спецыяльных творчых праектаў Галіноўскай Наталлі Сяргееўне ў сувязі з цяжкай і незаменнай стратай — смерцю маці.**

Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ

Так, у фокусе ўвагі публікі акажуцца нашумелыя стужкі Мітрыя Сямёнава-Алейнікава — “Адной крыві”, “Франка” (дыпламант “Лістапада — 2018”), а таксама ўжо вядомыя кароткаметражныя карціны Нэлі Васілеўскай — “Акуака”, “Рэканструкцыя бяссонніцы”, “Сябры па перапісцы”. Выпускніца БДАМ распавядзе і пра сваю новую работу — дакументальны паўнаметражны фільм “Шчасця, здароўя, табе, мілы сябра”. Прадзюсар і кампазітар Дзмітрый Фрыга прадставіць нашумелую камедыю “Гараш” кампаніі “Без буслоў Артс”.

Асаблівай цікавосткай Тыдня стане і творчая сустрэча з кінажурналістам і аўтарам “К” Тарасам Тарналіцкім.

К

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ